# ЗАОНІМЫ БРЭСТЧЫНЫ: СТРУКТУРНА-СЕМАНТЫЧНАЯ КЛАСІФІКАЦЫЯ

***Г. М. Дрозд***
*Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. С. Пушкіна (Брэст)*
*Навук. кір. – Л. В. Леванцэвіч, канд. філал. навук, дацэнт*

**Анатацыя.** У артыкуле падаецца структурна-семантычная класіфікацыя заонімаў Брэстчыны. Вызначаецца матывацыйная аснова клічак хатніх жывёл.

**Ключавыя словы:** заонім; клічка; структурна-семантычная класіфікацыя; анамастыка.

Новыя аб’екты рэчаіснасці становяцца прадметам вывучэння ў антрапаніміі (віды тавараў, магазіны, банкі, установы, палітычныя партыі, творчыя калектывы, сродкі масавай інфармацыі, урачыстыя мерапрыемствы і інш.). Зацікаўленасць лінгвістаў выклікалі і клічкі жывёл, ці заонімы. Пэўную характарыстыку заонімаў падаюць у сваіх працах Т. П. Раманава, Н. Р. Радчанка, Н. К. Дзмітрыеў, Н. Г. Дубавая, В. І. Супрун, О. І. Фанякова, В. І. Макіенка, О. Я. Фралова. Аднак аб’ектам спецыяльных комплексных даследаванняў ва ўсходнеславянскай анамастыцы заонімы яшчэ не сталі.

У артыкуле аналізуюцца клічкі хатніх жывёл (кот, сабака, конь, карова, певень, курыца, хамяк), якія ўжываюцца на тэрыторыі Брэсцка-Пінскага Палесся. У заонімах адлюстроўваюцца асаблівасці зносінаў чалавека з хатнімі жывёламі, гісторыя іменавання на лексічным і словаўтваральным узроўнях.

Сабраны матэрыял можна скласіфікаваць па наступных групах:

- уласнае імя: *Сеня*, *Мішка*, *Соня*; *Тёма*, *Эльза*;
- імёны літаратурных і кінагерояў, імёны вядомых асоб (акцёр, музыкант, спявак, мастак, спартсмен, палітык і інш): *Цэзар*; *Атос*, *Багіра*;
- клічкі-паняцці: *Сто баксаў*; *Бярозка*; *Белавушка*;
- міфонімы: *Русалка*, *Ундіна*;
- касмонімы: *Зорка*, *Месячык*;
- геаграфічныя назвы: *Рэйн*, *Эльбрус*, *Байкал*;
- адвольны набор гукаў: *Фіфі*, *Аяврік*;
- клічкі-характарыстыкі (асаблівасці паводзін і нораву, знешнасці): *Шустрый*, *Быстрый*, *Серый*;
- назвы іншых свойскіх і дзікіх жывёл: *Мышка*, *Зайчык*, *Белка*, *Тыгр* і іншыя.

Сярод матываваных заонімаў цікавасць выклікаюць тыя, якія звязаны са знешнімі асаблівасцямі і паводзінамі:

- заонімы, якія называюць жывёлу па колеры: *Белка* – сабака: мае пушысты і мяккі хвост, як у белкі (в. Магіліцы Івац.); *Бі̀м* – саба̀ка: усё цела было белае, толькі адно вуха чорнае (в. Чарняны Малар.); *Босік* – сабака: лапкі белыя,

нібы босы (в. Лукава Малар.); *Бяляш* – сабака: поўсць белага колеру (г. Пружаны); *Венера* – чорная карова, на якой было шмат белых маленькіх плямін (в. Валішча Пін.); *Мышка* – кабыла: была шэрага колеру (в. Чарняны Малар.); *Каштан* – конь: поўсць каштанавага колеру (в. Валішча Пін.); *Рыжык* – кот: рыжы па афарбоўцы (в. Чарняны Малар.); *Маліна* – карова: па колеры нагадвала маліны (в. Лукава Малар.);

- час і месца з'яўлення на свет: *Капля* – карова: нарадзілася пад час дажджу (в. Чарняны Малар.); *Крася* – карова: нарадзілася ў красавіку (в. Осаўцы Драг.); *Марта* – карова: нарадзілася ў сакавіку (в. Осаўцы Драг.); *Мая* – карова: нарадзілася ў маі (в. Чарняны Малар.); *Ночка* – карова: нарадзілася ноччу (в. Светач Бяроз.);
- асаблівасці паводзін: *Буранка* – карова: вельмі задзірыстая (в. Светач Бяроз.); *Вольная* – карова: мае свабодалюбівы нораў (в. Светач Бяроз.); *Голубка* – карова: вельмі ласкавая да гаспадароў (в. Осаўцы Драг.); *Дзік* – сабака: першыя дні жыцця ў сям'і ўсіх баяўся, быў як дзікі (в. Магіліцы Івац.); *Мурка* – кот: вельмі надаедліва мурлыкае (в. Чарняны Малар.);
- знешні выгляд: *Зорька* – карова: мае пляму ў выглядзе зоркі (в. Осаўцы Драг.); *Клякса* – кот: мае чорную пляму на пысе (в. Светач Бяроз.); *Кнопа* – сабака: была вельмі маленькая (в. Чарняны Малар.); *Орлік* – конь: на лбе меў пляму ў выглядзе арла (в. Чарняны Малар.); *Красуля* – карова: самая прыгожая ў статку (в. Светач Бяроз.); *Леў* – кот: знешне падобны да сапраўднага льва (в. Магіліцы Івац.); *Лысая* – карова, якая была з лысінай (в. Валішча Пін.); *Лыска* – сабака: мае белую пляму на лбе (г. Пружаны); *Лысоха* – карова: на лбе была лысіна (в. Чарняны Малар.); *Малыш* – сабака: хоць ужо і дарослы сабака, але ўсё роўна маленькі ростам (в. Лукава Малар.); *Орлік* – конь: быў велічны, статны, бы арол (в. Спорава Бяроз.); *Пушок* – кот: вельмі пушысты (в. Светач Бяроз.).

Самай характарыстычнай і значнай па колькасці зафіксаваных найменняў з'яўляецца група заонімаў, якая адлюстроўвае асаблівасці паводзін і нораву жывёлы, яе колер, знешні выгляд. Для матывацыі заонімаў актыўна ўключаецца самая разнастайная лексіка як уласная, так і агульная.